Аўтар: Рэдакцыя
10.07.2022 00:00

Інтэрнэт-партал Касцёла ў Беларусі

У выдавецтве Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі “Pro Christo” падрыхтаваны каляндар на 2023 год, прысвечаны святым і бласлаўлёным, лёс якіх звязаны з нашай краінай.

У прадмове да календара Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Юзаф Станеўскі напісаў: “Калі Бог будзе знаходзіцца ў цэнтры нашай увагі, тады кожны наш звычайны ўчынак будзе мець сэнс”.

Старонкі календара ўпрыгожаны выявамі святых і бласлаўлёных, змешчаны малітвы да іх. У календары пададзены ўсе абавязковыя святы і ўрачыстасці, успаміны святых і бласлаўлёных, якія адзначаюцца ў Каталіцкім Касцёле, а таксама асноўныя даты праваслаўных святкаванняў.

Рэлігійны часопіс

Малітва патрабуе адпаведнага месца. Езус, заклікаючы да малітвы, кажа: “Ты, калі молішся, увайдзі ў пакой свой і, зачыніўшы дзверы, маліся да Айца твайго, які ў таемнасці” (Мц 6, 6). На час малітвы неабходна адарвацца ад свету, а для гэтага трэба мець ціхае, святое месца. Мэта – падыхаць цішынёй, каб вярнуць спакойны рытм сэрца, падмацаванага прысутнасцю Бога.

У звычайных умовах найчасцей гаворка ідзе пра ціхае святое месца ў кватэры. У памяшканні трэба знайсці месца для размовы з Богам. Справа ў тым, каб накіраваць свой твар у той бок, дзе будзе найменш розных спраў і рэчаў, якія могуць дэканцэнтраваць нашу ўвагу.

З каталіцкіх СМІ Беларусі (32)

Аўтар: Рэдакцыя
10.07.2022 00:00



